

# ШТО МОГУЦЬ КАРАЛІ?

## Манархіі дасюль застаюцца ў палітычным мэйнстрыме свету

**У канцы мінулага тыдня ў «топе» інфармацыйных агенцтваў зноў апынулася Вялікабрытанія. І не ў сувязі з варыянтамі «брэксіту» ці мігрантамі. Зноў без перабольшвання сусветным ньюсмэйкерам стала каралева Лізавета II. Нагода была насамрэч значная — у «туманным Альбіёне» з пятніцы па нядзелю афіцыйна адсвяткавалі 90-годдзе самага вядомага сучаснага манарха ўсіх кантынентаў. А аналітыкі чарговы раз узважылі перспектывы цяперашніх манархій. Ці захаваецца такая форма дзяржаўнасці і надалей?**

### Гнуткая сістэма

Цяпер на планеце існуе крыху больш за 230 дзяржаў і самакіравальных тэрыторый, якія валодаюць міжнародным статусам. З іх толькі 41 краіна мае манархічную форму праўлення. Сучасная манархія — гэта надзвычай гнуткая і шматаблічная сістэма, што знаходзіцца ў дыяпазоне ад родаплемяннай формы (паспяхова дзейнічае ў арабскіх дзяржавах Блізкага Усходу) да манархічнага варыянту дэмакратычнай дзяржавы ў многіх еўрапейскіх краінах.

Першае месца па колькасці краін з манархічнай дзяржаўнасцю трымае Азія. Гэта прагрэсіўная і дэмакратычная Японія. Сюды ж адносяцца лідары мусульманскага свету — Бруней, Кувейт, Катар, Іарданія, Бахрэйн, Аман. У гэтую групу ўваходзяць дзве манархічныя канфедэрацыі — Малайзія і Аб'яднаныя Арабскія Эміраты. Таксама варта згадаць Тайланд, Камбоджу і Бутан.

Другое месца належыць Еўропе. Тут размешчана 12 манархій. Яны ў Старым Свеце прадстаўлены не толькі абмежаванай формай — у краінах, якія займаюць лідзіруючае становішча ў Еўрасаюза (Вялікабрытанія, Бельгія, Нідэрланды, Люксембург), але і абсалютнай формай праўлення — у так званых карлікавых дзяржавах: Манака, Ліхтэнштэйне, Ватыкане. Якасць жыцця ў гэтых краінах розная. Таксама адрозніваецца ўплыў манархаў на кіраванне дзяржавай.

Трэцяе месца сусветнага рэйтынгу — за краінамі Палінэзіі. Чацвёртае належыць Афрыцы, дзе цяпер захавалася ўсяго тры паўнавартасныя манархіі: Марока, Лесота, Свазіленд плюс некалькі сотняў «турыстычных». Тым не менш шэраг рэспубліканскіх краін вымушаны мірыцца з наяўнасцю на сваёй тэрыторыі традыцыйных мясцовых манархічных або родаплемянных утварэнняў і нават замацоўваць іх правы ў канстытуцыі. Сярод такіх — Уганда, Нігерыя, Інданезія, Чад. Нават такія краіны як Індыя і Пакістан, дзе былі скасаваны суверэнныя правы мясцовых манархаў (ханаў, султанаў, раджаў, магараджаў) яшчэ ў пачатку 70-х гадоў XX стагоддзя, часцяком вымушаны прызнаваць існаванне гэтых правоў, што называецца de facto. Урады звяртаюцца да аўтарытэту ўладальнікаў манархічных правоў падчас вырашэння рэгіянальных рэлігійных, этнічных, культурных спрэчак і іншых канфліктных сітуацый.



### Ад княства да султаната

Па тытуле ўладара сучасныя манархіі падзяляюцца на каралеўствы (самая вялікая група), княствы, эміраты, султанаты, ёсць таксама тэакратыя (вядома ж, Ватыкан) і нават імперыя (Садружнасць 16 краін, якая прызнае сваёй каралевай Лізавету II, — Антыгуа і Барбуда, Аўстралія, Багамскія астравы, Барбадас, Беліз, уласна Вялікабрытанія, Грэнада, Канада, Новая Зеландыя, Астравы Кука, Ніуэ, Папуа-Новая Гвінея, Сент-Вінсент і Грэнадзіны, Сент-Кітс і Невіс, Сент-Люсія, Саламонавы Астравы, Тувалу і Ямайка).



Агульная колькасць жыхароў манархій цяпер перавышае паўмільярда чалавек. Большасць, зразумела, жывуць у дзяржавах, дзе прадстаўлена канстытуцыйная форма кіравання. Тут улада манарха абмежавана канстытуцыяй. Да абсалютных (неабмежаваных) манархій адносяцца Бруней, Катар, Саудаўская Аравія, Аман, а таксама Аб'яднаныя Арабскія Эміраты (федэрацыя манархій).

Манархіі займаюць тэрыторыю каля 25 мільёнаў квадратных кіламетраў. Гэта дзесьці 17 працэнтаў агульнай плошчы сушы на нашай планеце. Унушальна выглядае, праўда. Тым больш, калі ўспомніць, што як-ніяк XXI стагоддзе на двары. Яшчэ больш яскрава падкрэсліваюць значнасць сучасных манархій іх эканамічныя паказчыкі. Як сцвярджаюць эксперты, доля гэтых дзяржаў у сусветным аб'ёме валавога ўнутранага прадукту складае 19,2 працэнта. Каля чвэрці гэтага паказчыка прыпадае на Японію. Таксама заўважныя пазіцыі займаюць Вялікабрытанія, Канада, Іспанія і Аўстралія. Усе іншыя манархіі выцягваюць каля 6 працэнтаў сусветнага ВУП.

Здавалася б, у сучасным свеце відавочная колькасная перавага на баку рэспубліканскіх дзяржаў. Аднак пры бліжэйшым разглядзе аказваецца, што гэтыя краіны ў большасці сваёй належаць да так званага трэцяга свету і ўтварыліся ў выніку распаду каланіяльнай сістэмы. Часцяком створаныя па каланіяльных адміністрацыйных межах, гэтыя дзяржавы з'яўляюцца вельмі няўстойлівымі ўтварэннямі. Яны могуць крышыцца і відазмяняцца, што відаць, напрыклад, у Іраку. Яны ахоплены бесперапыннымі канфліктамі, як значная колькасць краін Афрыкі. І ўжо цалкам відавочна не ўваходзяць у разрад перадавых дзяржаў.

Вядома, манархія не вырашае аўтаматычна ўсе сацыяльныя, эканамічныя і палітычныя праблемы. Але тым не менш яна можа прадставіць вядомую долю стабільнасці і раўнавагі ў палітычнай, сацыяльнай і нацыянальнай структуры грамадства. Вось чаму ад манархіі не спяшаюцца пазбавіцца нават тыя краіны, дзе яна існуе выключна намінальна, скажам Канада або Аўстралія. Палітычная эліта гэтых краін у большасці сваёй разумее, наколькі важна для раўнавагі ў грамадстве, каб вярхоўная ўлада была апрыёры замацавана ў адных руках і палітычныя колы не вялі за яе супрацьстаянне, а працавалі ў імя інтарэсаў усёй нацыі. Больш за тое, гістарычны вопыт паказвае, што лепшыя ў свеце сістэмы сацыяльнага забеспячэння пабудаваны менавіта ў манархічных дзяржавах. І гаворка ідзе не толькі аб манархіях Скандынавіі, дзе нават савецкі агітпрап (у манархічнай Швецыі) здолеў адшукаць варыянт «капіталізму з чалавечым тварам». Такая сістэма, напрыклад, пабудавана ў сучасных краінах Персідскага заліва.



### Прага да рэстаўрацыі?

Манархія ў сучасным свеце — адна з тэм, якія актыўна абмяркоўваюцца ў Еўропе. Адносна яе людзі падзяляюцца на два лагеры — прыхільнікаў і праціўнікаў. Прыхільнікі выступаюць за захаванне традыцый, кажучы аб манархіі, як аб сімвале дзяржавы, якая цэментуе асновы грамадства. Праціўнікі нагадваюць пра страту рэальнай улады большасцю кіруючых манархаў, нежаданне падаткаплацельшчыкаў утрымліваць бутафорскія дынастыі, адзінымі функцыямі якіх з'яўляюцца прадстаўнічыя, дабрачынныя, культурныя. Праўда, большасць простых людзей не супраць манархій.

Як заўважаюць эксперты, гістарычны вопыт сведчыць, што ў шматнацыянальных дзяржавах цэласнасць краіны шмат у чым звязана з манархіяй. Гэта мы бачым у мінулым, на прыкладзе Расійскай імперыі, Аўстра-Венгрыі, Югаславіі, Ірака. Скасаванне манархіі ў шэрагу сучасных краін немінуча прывяло б да спынення іх існавання як шматнацыянальных, адзіных дзяржаў. Гэта ў першую чаргу адносіцца да Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі, а таксама Малайзіі, Саудаўскай Аравіі. Так, 2007 год відавочна паказаў, што ва ўмовах парламенцкага крызісу, які ўзнік з-за нацыянальных супярэчнасцяў фламандскіх і валонскіх палітыкаў, толькі аўтарытэт караля бельгійцаў Альберта II утрымаў краіну ад распаду на два ці нават больш самастойных дзяржаўных утварэнняў. У шматмоўнай Бельгіі нават нарадзіўся жарт, што адзінства яе народа змацоўваюць усяго тры рэчы — піва, шакалад і кароль! Тады як адмена манархічнага ладу ў 2008 годзе ў Непале ўвяла гэтую дзяржаву ў чараду палітычных крызісаў і перманентнага грамадзянскага супрацьстаяння.

Другая палова XX стагоддзя дае нам некалькі паспяховых прыкладаў вяртання народаў, якія перажылі эру нестабільнасці, грамадзянскіх войнаў і іншых канфліктаў, да манархічнай формы кіравання. Самы вядомы і, несумненна, шмат у чым удалы выпадак рэстаўрацыі —



Іспанія. Гэтая краіна прайшла праз грамадзянскую вайну, эканамічны крызіс і правую дыктатуру, вярнулася да манархічнай формы кіравання, заняўшы годнае месца сярод еўрапейскіх дзяржаў. Таксама манархічныя рэжымы на мясцовым узроўні былі аднаўлены ва Угандзе, пасля падзення дыктатуры маршала Ідзі Аміна (1928-2003), у Інданезіі, якая, пасля сыходу генерала Махамеда-Ходжа Сукарта (1921-2008) перажывае сапраўдны манархічны рэнесанс.



Некаторыя эксперты, абмяркоўваючы карысць і шкоду манархіі, прыводзяць у прыклад Англію, Іспанію, Швецыю і Нарвегію. Гэтыя краіны захавалі нармальны манархічны рэжым, а манархі ў іх не з'яўляюцца толькі сімвалічнымі фігурамі, сапраўды кіруючы дзяржавай. Прыхільнікі таго, што ў гэтых краінах манархі валодаюць рэальным аўтарытэтам, спасылаюцца на асноўныя законы дзяржаў, згодна з якімі манархі валодаюць сур'ёзнымі ўладнымі паўнамоцтвамі. Так, напрыклад, каралева Вялікабрытаніі прызначае ўрад, мае права распусціць парламент, ні адзін законапраект, які быў прыняты парламентам, не лічыцца сапраўдным без подпісу манарха. Іх апаненты заяўляюць у адказ, што ўсе гэтыя палажэнні — не больш чым фармальнасць, паколькі рэальная ўлада знаходзіцца ў руках партыйнай алігархіі.

Стабільнасць палітычнай і эканамічнай сістэм большасці манархічных краін робіць іх не толькі не састарэлымі, але прагрэсіўнымі і прывабнымі, прымушае раўняцца на іх па шэрагу параметраў. Зразумела, манархія мае як плюсы, так і мінусы. Сярод недахопаў гэтай палітычнай сістэмы звычайна называюць становішча манарха па-над законам, верагоднасць узнікнення дыктатуры і залежнасць цэлай дзяржавы ад аднаго чалавека. Аднак, як казала некалі брытанскі прэм'ер Маргарэт Тэтчэр, «той, хто сцвярджае, што палітык можа кіраваць краінай лепш за спадчыннага манарха, павінен лепш пазнаёміцца з палітыкамі».



Дарэчы, Лізавета II уступіла на трон у 1952 годзе ва ўзросце 25 гадоў. Кіраўніком СССР тады быў Іосіф Сталін, прэзідэнтам ЗША — Гары Трумэн, прэм'ер-міністрам Вялікабрытаніі — Уінстан Чэрчыль. За больш чым 60 гадоў, якія яна знаходзіцца ва ўладзе, у Злучаным Каралеўстве змяніліся 12 кіраўнікоў урада, у ЗША — столькі ж прэзідэнтаў, а ў Ватыкане — сем Пап. Лізавета II стала манархам, які кіруе даўжэй за ўсіх у гісторыі брытанскай кароны. Напэўна, яе прыклад найбольш яскравы доказ на карысць сцвярджэнняў пра жыццяздольнасць манархій. Ці не так?

**Захар БУРАК.**
*burak@zviazda.by*